**Януш, І.** Паверхневыя воды / І. Януш // Лепельскі край. – 2005. – 26 жн. – С. 2.

## ПАВЕРХНЕВЫЯ ВОДЫ

За вялікую колькасць рэк і азёр Беларусь называюць сінявокай. У нашай мясцовасці распаўсюджаны невялікія раўнінныя рэкі, што працякаюць у шырокіх далінах, звычайна маюць звілістыя рэчышчы з чаргаваннем плёсаў (больш глыбокіх участкаў) і перакатаў (мелкаводных месцаў), невялікія нахілы воднай паверхні, павольнае цячэнне. Вытокі рэк найчасцей пачынаюцца з крыніц, балот, радзей – з азёр. У сувязі з вярчэннем Зямлі вакол восі, нашых рэк, што цякуць з поўначы на поўдзень ці наадварот, правыя берагі больш падмытыя вадою, больш стромкія, чым левыя. Сярэдняя хуткасць цячэння рэк 0,3–0,6 м/сек. Замярзаюць рэкі зімой на 80–140 сутак. Сярэдняя таўшчыня лёду 25–60 см. У асобныя суровыя зімы маленькія рэчкі прамярзаюць да дна. Летам тэмпература вады 19–22 градусы.

Усяго на Лепельшчыне звыш 80 малых і сярэдніх рэк і ручаёў. Па тэрыторыі раёна часткова праходзіць водападзел паміж басейнамі рэк, што нясуць ваду ў Чорнае мора (р. Бярэзіна з р. Сергуч і іншымі прытокамі) і ў Балтыйскае мора (р. Заходняя Дзвіна з Улай, Эсай і іншымі прытокамі).

На мяжы з Докшыцкім раёнам працякае рака Бярэзіна – правы прыток Дняпра. Пачынаецца з забалочанага ўчастка ля г. Докшыцы. Шырыня рэчышча ў верхнім цячэнні 15–20 м. На нашай тэрыторыі не суднаходная. Узнікла рака пасля апошняга (паазерскага) абледзянення 15–20 тыс. гадоў таму. З возера Тэкліц бярэ пачатак прыток Бярэзіны рака Сергуч, якая мае даўжыню 47 км і расход вады ў вусці 1,6 куб.м/сек. Цячэ рака праз азёры Вольшыца, Плаўна, Манец, частка сцёку трапляе ў Бярэзінскі канал былой воднай сістэмы (басейн Заходняй Дзвіны). Ніжэй возера Манец раку называюць Бузянка.

Рака Ула (Ульянка) з’яўляецца прытокам Заходняй Дзвіны, улівае ў яе ў адну секунду ў сярэднім 25,4 куб.м вады. Мае агульную даўжыню 123 км і рэчышча шырынёй 20–25 м. Берагі абрывістыя, часам стромкія, параслі хмызняком. На Уле адноўлена гідраэлектрастанцыя магутнасцю 320 кВт.

Рака Эса (агульная даўжыня 84 км) знаходзіцца ў басейне Заходняй Дзвіны, бярэ пачатак у Мінскай вобласці. Сярэдні расход вады ў Лепельскае возера роўны 7,28 м$^3$/сек. Рэчышча вельмі звілістае. Мае прытокі – р. Байна (даўжыня 17 км), р. Свядзіца (34 км), р. Бярэшча (7,2 км).

Цудоўныя, надзвычай пранікнёныя вершы аб беларускіх рачулках напісаў Якуб Колас:

Між алешын, кустоў,
    дзе пяе салавей,
І звініць і грыміць
    срэбразвонны ручэй.

Лепельшчына – азёрны край, дзе 137 азёр маюць назвы і 70 без назваў. Найбольшыя з іх Лепельскае, Бярэшча, Окана, Тэкліц, Домжарыцкае, Ворань, Бобрыца, Астроўна. З’яўленне азёр звязана з дзейнасцю апошняга (паазерскага) ледавіка. Напрыклад, рэштkавыя азёры Окана, Бярэшча, Домжарыцкае пакінула велізарнае старажытнае прыледавіковае возера, што размяшчалася на Верхнебярэзінскай нізіне. Гэта неглыбокія, з забалочанымі берагамі, зарастаючыя азёры.

Ёсць у нас падпрудныя азёры (утварыліся ў выніку накаплення талых вод у паніжэннях паміж марэннымі градамі); лагчынныя (узніклі пры выворванні ледавікамі вузкіх па форме, выцягнутых з паўночнага захаду на паўднёвы ўсход у напрамку руху ледавікоў); тэрмакарставыя (з'явіліся ў выніку раставання паверхневых лінзаў лёду, звычайна малыя і неглыбокія). Сустракаюцца і складаныя азёрныя катлавіны з вельмі звілістай берагавой лініяй. Узніклі яны ў выніку ўзаемадзеяння розных па характару працэсаў утварэння.

У водным жыўленні лепельскіх азёр пераважаюць атмасферныя ападкі. У глыбокіх вадаёмах аб'ём вады мяняецца за 5–10 гадоў, у мелкаводных – за 1–2 гады.

Тэмпература вады летам на глыбокіх азёрах паніжаецца ў сярэднім на 3–5 градусаў праз кожны метр глыбіні, ніжні слой мае тэмпературу 7–5 градусаў. Зімой, наадварот, тэмпература павышаецца ад 0 да 3–4 градусаў каля дна. Найбольш блізкім і знаёмым нам з'яўляецца Лепельскае возера, што мае плошчу 10,18 км$^2$ і самую вялікую сярод азёр глыбіню – 33,7 м. Катлавіну вадаёма ўмоўна падзяляюць на тры часткі, што маюць мясцовыя назвы: паўночная – Кусцінскае возера (па прозвішчу знакамітага археолага з в. Завідзічы); паўднёвая – Гарадское возера; усходняя – Белае возера. Дно вадаёма да глыбінь 7–7,5 м выслана пяскамі, глыбей – сапрапелямі. Упадаюць рэкі Эса, Зеха, некалькі ручаёў, выцякае адна – Ула.

Прывабным для лепяльчан з'яўляецца Святое возера. Плошча яго 11 гектараў, даўжыня – 530 м, шырыня 340 м. Найбольшая глыбіня 8,7 м. Аб'ём вады крыху больш за паўмільёна м$^3$. Даўжыня берагавой лініі 1,35 км. Дно выслана глеем, уздоўж берагоў – пясчанае. Як сведчыць легенда, тут калісьці было высокае месца з прыгожым храмам. Потым мясцовасць апусцілася, утварылася возера, якое назвалі Святым.

Нашы рэкі і азёры з'яўляюцца накапляльнікамі чыстай прэснай вады. У іх значныя рыбныя запасы (прамысловае значэнне маюць лешч, плотка, шчупак, акунь, карась). Каштоўнай арганічнай сыравінай з'яўляецца сапрапель. Праз Лепельшчыну праходзіў адзін са старажытнейшых шляхоў зносін «з варагаў у грэкі». Многія азёры выкарыстоўваюцца для санаторна-курортнага лячэння (Лепельскае, Бобрыца, Плаўна), для адпачынку і турызму. Захаванне ў чысціні вадаёмаў для нашчадкаў – адна з важнейшых прыродаахоўных задач сучаснасці.

**Ілья Януш, краязнаўца**